9(С3)(075.8)
К-937

# Курсавыя і дыпломныя работы




# па гісторыі Беларусі



Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

# КУРСАВЫЯ І ДЫПЛОМНЫЯ РАБОТЫ па гісторыі Беларусі

*Метадычныя рэкамендацыі*

Мінск 2003

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Беи)я73
К937

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Складальнікі:* М. М. Забаўскі, доктар гістарычных навук, прафесар;
І. Б. Канапацкі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
В. Ф. Кушнер, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
А. Э. Лютая, ст. выкладчык;
В. А. Пілецкі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
А. Ф. Рацько, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
М. К. Сакалоў, доктар гістарычных навук, прафесар;
Л. Л. Шкуцько, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
А. А. Цобкала, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

*Рэцэнзент* А. А. Каваленя, доктар гістарычных навук, прафесар

К937 Курсавыя і дыпломныя работы па гісторыі Беларусі: Метад. рэк. / Пад рэд. М. К. Сакалова.— Мн.: БДПУ, 2003.— 75 с.
ISBN 985-435-483-0

У дапаможніку даюцца агульныя метадычныя рэкамендацыі і парады для падрыхтоўкі, выканання курсавой і дыпломнай работ па гісторыі Беларусі. Прыводзіцца прыкладная тэматыка і планы па актуальных пытаннях у адпаведнасці з вучэбнай праграмай. Названа асноўная літаратура да тэм, якую неабходна абавязкова выкарыстоўваць пры напісанні работ.

Адрасуецца выкладчыкам, студэнтам дзённага і завочнага форм навучання гістарычнага факультэта.

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Беи)я73

ISBN 985-435-483-0

© Калектыў складальнікаў, 2003
© ВВЦ БДПУ, 2003

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ КУРСАВЫХ І ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ

Вучэбным планам гістарычнага факультэта прадугледжваецца абавязковае выкананне курсавой работы па гісторыі Беларусі. Па жаданні студэнтаў выпускных курсаў імі рыхтуюцца дыпломныя работы, у тым ліку і па праблемах гісторыі Беларусі. Курсавая і дыпломная работы маюць мэтай сістэматызацыю, замацаванне і пашырэнне тэарэтычных і практычных ведаў, паглыбленае вывучэнне актуальных праблем гістарычнага мінулага Беларусі, валоданне метадалогіяй навуковага даследавання, набыццё навыкаў працы з першакрыніцамі і літаратурай, афармленне выкарыстанай бібліяграфіі.

Для дапамогі і кантролю за выкананнем курсавой работы кафедра вылучае кожнаму студэнту навуковага кіраўніка. Пры выкананні дыпломнай працы яе аўтар па сваім жаданні выбірае навуковага кіраўніка з прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры, які зацвярждаецца загадам дэкана факультэта.

## Выбар тэмы

Кафедра гісторыі Беларусі прапануе тэматыку курсавых і дыпломных работ, якая ахоплівае перыяд ад старажытных часоў да сённяшніх дзён, высвятляе разнастайныя праблемы гістарычнага мінулага беларускага народа. Кожны студэнт па ўласным жаданні і сумесна з навуковым кіраўніком вызначае тэму курсавога даследавання ці дыпломнай працы ў адпаведнасці са сваімі інтарэсамі, зацікаўленасцю да вывучэння таго ці іншага перыяду, той ці іншай праблемы. Дапускаецца ўдакладненне, канкрэтызацыя названых кафедрай тэм курсавых і дыпломных прац альбо прапанаванне іншых тэм з улікам іх актуальнасці. Пасля ўзгаднення з навуковым кіраўніком тэмы курсавой работы, яна зацвярджаецца кафедрай, а тэма дыпломнай працы — загадам па факультэце. Змяненне тэмы пасля яе зацвярджэння дапускаецца толькі ў выключных выпадках, на падставе абгрунтаваных прычын і пры згодзе навуковага кіраўніка. Пасля абрання тэмы дыпломнай работы і яе зацвярджэння, аўтар разам з навуковым кіраўніком складаюць план-заданне для яе выканання, які зацвярджаецца кафедрай.

## Выкананне курсавой і дыпломнай работ

Працу над работай мэтазгодна пачаць з агульнага знаёмства са зместам праблем, якія будуць даследавацца ў выбранай тэме. Кафедрай акрэсліваецца тэматыка і план работы. У першую чаргу варта звярнуцца

да падручнікаў ці дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, агульнавядомай літаратуры. Гэта дасць магчымасць уявіць асноўныя напрамкі вывучэння праблемы, яе змест, месца у гістарычным працэсе, асэнсавана падысці да складання плана.

План ***курсавой*** работы ўключае «Уводзіны», прыкладна 3—4 асноўныя раздзелы, «Заключэнне», а таксама спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры. Калі ёсць неабходнасць, то ў канцы работы можа быць змешчаны «Дадатак» (адзін ці некалькі) у выглядзе дыяграм, табліц, схем, ілюстрацый ці інш. Дакладныя фармулёўкі асноўных частак плана неабходна ўзгадніць з навуковым кіраўніком. У ***дыпломнай*** працы, якая з'яўляецца больш расшыранай у параўнанні з курсавой, колькасць асноўных частак плана можа быць павялічана.

Пасля гэтага пачынаецца праца па вылучэнні асноўных гістарычных першакрыніц, збору фактычнага матэрыялу, вывучэнні навуковых прац і публікацый па тэме даследавання. Асноўныя крыніцы і літаратура, названыя ў прапанавым выданні па стане на канец 2001 г., складаюць абавязковы мінімум да кожнай тэмы курсавой работы. У дыпломнай рабоце неабходна пашырыць кола першакрыніц і літаратуры, асабліва за кошт вывучэння публікацый у навуковых часопісах, матэрыялаў канферэнцый, дысертацыйных даследаванняў. Для пошуку такіх звестак мэтазгодна выкарыстоўваць даведачна-бібліяграфічныя аддзелы бібліятэк, бібліяграфічныя выданні і работы. Пры выкананні дыпломных работ вялікую каштоўнасць уяўляюць архіўныя звесткі, матэрыялы музеяў па тэме даследавання.

Сабраны фактычны і навуковы матэрыял неабходна сістэматызаваць, асэнсаваць, пасля чаго можна пераходзіць да напісання тэксту асноўных раздзелаў у адпаведнасці са складзеным планам. Па усіх пытаннях, якія ўзнікаюць на працягу працы над курсавой ці дыпломнай работы, студэнт мае права звяртацца за парадамі да навуковага кіраўніка.

## Асноўныя патрабаванні да курсавой і дыпломнай работ

***Курсавая работа*** па гісторыі Беларусі павінна быць смастойным і творчым даследаваннем адной з праблем гістарычнага мінулага на падставе вывучэння гістарычных крыніц і навуковай літаратуры. ***Дыпломная*** работа больш глыбока адлюстроўвае розныя падыходы да вывучэння і асэнсавання гістарычных фактаў і падзей, існуючых у навуковай літаратуры. Яна павінна выяўляць асабістую пазіцыю аўтара работы ў навуковых дыскусіях, абгрунтаваную доказамі і разважаннямі.

*Галоўнымі метадалагічнымі прынцыпамі* навуковага даследавання павінны быць аб'ектыўнасць і гістарызм у высвятленні прычын і ўмоў з'яўлення канкрэтных падзей ці тэндэнцый развіцця, іх сутнасці і зместу, гістарычнага ўплыву на стан беларускага грамадства і гістарычны лёс народа Беларусі. Неабходна крытычна ставіцца да існуючых пунктаў гледжання на тую ці іншую праблему, якія сустракаюцца ў гістарычных выданнях ранейшых гадоў і сучасных публікацыях.

*Ва «Уводзінах» **курсавой** работы павінна быць*:

— абгрунтаванне актуальнасці тэмы даследвання і вызначэнне яе храналагічных межаў;
— бібліяграфічны агляд існуючых па тэме першакрыніц і літаратуры;
— фармулёўка мэты, якая ставіцца ў даследаванні, задач, якія вырашаюцца пры яго правядзенні.

Ва *«Уводзінах» **дыпломнай** работы акрамя таго неабходны*:

— крытычны аналіз поглядаў і ацэнак, якія існуюць па праблеме ў розных выданнях і розных даследчыкаў;
— вызначэнне ўласнай пазіцыі аўтара работы ў дачыненні да спрэчных і дыскусійных праблем;
— ацэнка сучаснага стану навуковай распрацоўкі і асвятлення ў айчыннай і замежнай літаратуры абранай праблемы;
— высвятленне поглядаў і ацэнак, якія з'яўляюцца спрэчнымі і патрабуюць перагляду ці ўдакладненняў.

*У асноўных частках (раздзелах, главах) даследавання*, якія вызначаны планам, прыводзіцца дакладна-гістарычны матэрыял, які раскрывае абраную тэму. Неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на перыядызацыю і паўнату гістарычных звестак, іх храналагічную паслядоўнасць і лагічную сувязь. У канцы кожнага раздзела павінны быць абгрунтаваныя і аргументаваныя фактычным матэрыялам абагульненні і вывады, да якіх прыйшоў аўтар работы.

*У «Заключэнні» неабходна падвесці асноўныя вынікі* праведзенага даследавання, даць гістарычную ацэнку з'яў і фактаў, сучаснае навуковае бачанне праблемы.

Спіс выкарыстаных першакрыніц і літаратуры ўключае ўсе выданні, якімі карыстаўся аўтар работы пры распрацоўцы тэмы, а таксама пералік архіўных фондаў і спраў, на якія ёсць спасылкі ў дыпломнай рабоце.

## Афармленне работы

Тытульны ліст курсавой ці дыпломнай работ афармляецца ў адпаведнасці з узорамі, якія змешчаны на ст. 7—8.

*На асобнай старонцы* прыводзіцца план курсавой ці дыпломнай работ з указаннем нумароў лістоў.

Кожны раздзел у тэксце мае загаловак.

Крыніцы, літаратура (цытаты, спасылкі на крыніцы пры выкарыстанні фактыў, лічбаў, цытат і інш.) афармляюцца па правілах і нормах, якія ўжываюцца ў навуковых выданнях.

Спіс першакрыніц і літаратуры ў канцы работы даецца ў алфавітным парадку з дакладным указаннем месца і года выдання.

Усе старонкі работы неабходна пранумараваць. Яна павінна быць напісана граматна, разборліва і акуратна. На апошняй старонцы работы аўтар ставіць асабісты подпіс.

Агульны памер курсавой работы — да 30 старонак, дыпломнай — да 50 старонак.

## Абарона курсавой і дыпломнай работ

Пасля напісання работы аўтар прадстаўляе тэкст навуковаму кіраўніку для азнаямлення. Навуковы кіраўнік можа рабіць заўвагі, выказваць пажаданні па змесце і афармленні. Пры неабходнасці работа дапрацоўваецца, афармляецца адпаведным чынам.

Навуковы кіраўнік прадстаўляе водзыў, дае заключэнне аб допуску на яе абарону.

Абарона ***курсавой работы*** адбываецца ў тэрміны, вызначаныя кафедрай. Ёй ствараецца камісія ў складзе не менш трох чалавек з ліку супрацоўнікаў кафедры, на пасяджэнні якой адбываецца абарона курсавой работы. Аўтару работы прадстаўляецца магчымасць зрабіць даклад для паведамлення аб змесце і выніках праведзенага даследавання, яму могуць быць зададзены пытанні па тэме. На падставе знаёмства са зместам курсавой работы і яе абаронай аўтарам, камісія ставіць адзнаку, якая ўносіцца ў заліковую кніжку і падпісваецца ўсімі членамі камісіі.

***Дыпломная*** работа за месяц да вызначанага тэрміну абароны прадстаўляецца на кафедру з водгукам навуковага кіраўніка. На пасяджэнні кафедры адбываецца папярэдняя абарона дыпломнай работы, на падставе якой прымаецца рашэнне аб яе гатоўнасці і допуску да абароны. На падрыхтаваную дыпломную работу даецца рэцэнзія аднаго з прафесараў ці дацэнтаў факультэта.

Абарона дыпломнай работы адбываецца на пасяджэнні Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі і афармляецца пратаколам. Дыпломная работа з'яўляецца кваліфікацыйнай працай выпускніка. Па ўзроўні выканання дыпломнай работы і выніках яе абароны Дзяржаўная экзаменацыйная камісія робіць заключэнне аб магчымасці прысуджэння выпускніку адпаведнай кваліфікацыі.

4. Бежанства і нелегальная міграцыя ў Рэспубліку Беларусь.
5. Пошук шляхоў вырашэння праблем нацыянальных меншасцей у Рэспубліцы Беларусь.

Крыніцы і літаратура: 5, 8, 11, 13—14, 20, 24, 27, 31, 40—43, 52, 63, 68, 79, 99, 112, 119, 120.

### Тэма 10. *Рэлігійнае жыццё Беларусі ў сучасных умовах*

Уводзіны.
1. Рэлігійная талерантнасць беларусаў як гістарычная традыцыя і іх нацыянальная адметнасць.
2. Асноўныя рэлігійныя канфесіі на Беларусі і іх дзейнасць.
3. Дзяржаўная палітыка ў рэлігійным пытанні.
4. Рэлігіі і адукацыя, іх узаемаадносіны.
5. Барацьба з дэструктыўнымі рэлігійнымі сектамі і арганізацыямі.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 3, 13, 20, 25—26, 46, 68, 70, 76, 82—83, 106, 114, 119, 123.

### Тэма 11. *Беларускае замежжа*

Уводзіны.
1. Асаблівасці эміграцыі падчас і пасля другой сусветнай вайны.
2. Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у адносінах да беларусаў, якія знаходзяцца за яе межамі. З'езды беларусаў свету.
3. Беларуская культура за мяжой як састаўная частка нацыянальнай і сусветнай культуры.
4. Праблемы ў жыцці беларусаў за межамі Бацькаўшчыны.
5. Праблемы і перспектывы кансалідацыі беларускай нацыі.

Заключэнне.

Крыніцы і літаратура: 7, 12—13, 20, 30, 47, 49, 52, 65—66, 68, 73, 78, 89, 103, 105, 119, 123.

## КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

1. Абрамчук С. Н. Государственное регулирование свободных экономических зон в Республике Беларусь. Брест, 2001.
2. Архітэктура Беларусі. Энцыкл. давед. Мн., 1993.
3. Бабосов Е. М. Динамика религиозности в независимой Белоруссии. Мн., 1995.
4. Багдановіч А. Г. Незалежнасць, адарваная ад народа, застаецца ілюзіяй.
5. Байрам. Часопіс беларускага грамадскага аб'яднання татар. 1991—2001 гг.

6. Барыс А. Сучасныя партыя на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 1.

7. Барыс С. Трэці з'езд беларусаў свету // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 5.

8. Басін Я., Барыс С. Яўрэі і іўдаізм на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 3.

9. Басюк І., Сільчанка М. Аб дзяржаўным статусе беларускай мовы ў гісторыі Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 1.

10. Белавус С. Вексаль на Беларусі: гісторыя і сучаснасць / Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 2.

11. Беларуска-грэчаскія ўзаемаадносіны ад старажытнасці да сучаснасці: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 26 кастр. 2000). Мн., 2000.

12. Беларусіка: Матэрыялы міжнар. навук. канф. Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Мн., 1992. Кн. 2.

13. Беларусь: Энцыкл. давед. Мн., 1995.

14. Белорусы в Сибири. Новосибирск, 2000. Вып. 1—2.

15. Белорусы: серия «Народы и культура». М., 1998.

16. Васілевіч Р. Развіццё заканадаўства аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 3.

17. Васілевіч Р. А., Доўнар Т. І., Юхо І. А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі. Мн., 2001.

18. Волкогонов Д. Семь вождей: галерея лидеров СССР. В 2-х кн. М., 1996.

19. Выступление Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко на II съезде учителей 3 ноября 2001 года // Беларускі гістарычны часопіс. 2002. № 1.

20. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. / Пад рэд. Я. Новіка, Г. Марцуля. Мн., 2000. Ч. 2.

21. Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. Мн., 1997. Т. 1—6.

22. Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Мн., 1997. Т. 3.

23. Государственность Беларуси: Проблема формирования в программах политических партий. Мн., 1999.

24. Грэкі на Беларусі. (На пытанні галоўнага рэдактара часопіса В. Кушнера адказвае прэзідэнт грамадскага аб'яднання грэчаскага нацыянальна-культурнага таварыства «Алкестыда» Ц. Папунідзі) // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 1.

25. Грыгор'ева В., Навіцкі У., Філатава А. Уніяцтва на Беларусі ад Полацкага сабора да нашых дзён // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 2.

26. Грыгор'ева В., Завальнюк У., Навіцкі У., Філатава А. Канфесіі на Беларусі. (канец XVIII—XX ст.). Мн., 1998.

27. XX стагоддзе гісторыі паляка і беларуса. Матэрыялы беларуска-польскай навук. канф. 20—21 лістап. 2000 г. Мн., 2001.

28. Денисюк Н. Избирательная система Республики Беларусь. Мн., 1990.

29. Дзічкоўскі А., Святліцкі І. Фактары эканамічнага росту Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 1.

30. Другі з'езд беларусаў свету // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 3.

31. Дулін С., Канапацкі І. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць. Мн., 1993.

32. Дэкларацыя Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (27 ліпеня 1990 г.). Мн., 1990.

33. Дылян Г. Інавацыйныя падыходы ў рэфармаванні сістэмы школьнай адукацыі Рэспублікі Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 1.

34. Жудро М. К. Формирование экономической среды для эффективного развития агробизнеса. Горький, 2001.

35. Жук А. Рэспубліканскі інстытут Вышэйшай школы пры БДУ: станаўленне і перспектывы развіцця // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 4.

36. Закон Республики Беларусь «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь». Мн., 1991.

37. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Беларускай ССР». Мн., 1991.

38. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб мовах у Беларускай ССР». Мн., 1990.

39. Заява кіраўніцтва дзяржаў Рэспублікі Беларусь, РСФСР, Украіны. Пагадненне аб стварэнні садружнасці незалежных дзяржаў // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1992. № 6.

40. Иоффе Э. Страницы истории евреев Беларуси: Краткий науч.-популярный очерк. Мн., 1996.

41. Канапацкі І. Татары на Беларусі. Іх рэлігія // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 2.

42. Канапацкі І., Смолік А. Гісторыя і культура беларускіх татар. Мн., 2000.

43. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Мн., 1994.; Мн., 1996.

44. Касцюк М. П. Сталінщчына і Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 1—2.

45. Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі (1917—1994 гг.). Мн., 2000.

46. Католицизм в Беларуси: организация вероучения, история. Гродно, 1992.

47. Кіпель В. Беларусы ў ЗША. Мн., 1993.

48. Кохно П. А. Вклад экономики Белоруссии в союзное государство. Мн., 2001.

49. Культура беларускага замежжа. Мн., 1990. Кн. 1—2.

50. Кучынскі В., Улаховіч М. Эканамічны крызіс і інфармацыйная палітыка ў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 4.

51. Кушнер В. Першы прэзідэнт Рэспублікі Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 3.

52. Кушнер В., Сяргеева Г. Беларусы ў Кліўлендзе // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 2.

53. Кушнер В. Цяжкія шляхі адраджэння дзяржаўнасці // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 2.

54. Кушнер В. Першы з'езд настаўнікаў Рэспублікі Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 4.

55. Кушнер В. Праблемы навукі і адукацыі можна вырашыць толькі сумеснымі намаганнямі // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 4.

56. Кушнер В. Рэформа адукацыі набывае новыя якасці (II з'езд настаўнікаў Рэспублікі Беларусь) // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 6.

57. Лукашэнка А. «Я абяцаю народу Беларусі, што Прэзідэнт і ўрад не зробяць ніводнага непралічанага і несумленнага кроку ў адносінах да людзей». Выступленне Прэзідэнта А. Лукашэнкі на сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь // Народная газета. 1994. 22 ліп.

58. Лыч Г. Рынок и экономика Республики Беларусь // Вопросы экономики. 1992. № 3.

59. Лыч Г. И. Рыночное формирование экономики Беларуси. Итоги и перспективы. Мн., 2000.

60. Лыч Л. Беларуская нацыя і мова. Мн., 1991.

61. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1997.

62. Лыч Л. Вытокі беларускай нацыянальнай ідэі. // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 3.

63. Лыч Л. Татарская культура на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 1.

64. Марчанка І. Новыя гарады Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 2.

65. Маці — краіна // Звязда. Спецыяльны выпуск да Першага з'езда беларусаў свету. 1993. ліп.

66. Мірановіч Я. Навейшая гісторыя Беларусі. Беласток, 1999.

67. Мясніко А. Дзеля гэтага варта жыць (пра сённяшні дзень Беларусі). Мн., 2000.

68. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн., 1995. Ч. 2.

69. Наука и образование на пороге третьего тысячелетия: Тез. докл. междунар. конгр. Мн., 3—6 окт. 2000 г. В 2-х кн. Мн., 2000.

70. Одинцов М. И. Государство и церковь в Росии: XX век. М., 1994.

71. О состоянии и задачах развития национальной системы образования (доклад министра образования Республики Беларусь П. И. Бригадина на II съезде учителей Республики Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 1.

72. Палітычныя партыі і грамадска-палітычныя рухі Беларусі // Беларусістыка: Тэматычны зборнік. Мн., 1993. № 21.

73. Першы з'езд беларусаў свету: Дакументы. // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 3.

74. Пилипенко М. Ф. Возникновение Белоруссии: Новая концепция. Мн., 1991.

75. Попов Ф. Атомную бомбу делали и наши земляки // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 4.

76. Поспеловский Д. В. Русская православная церковь в XX веке. М., 1995.

77. Права человека. Сборник международных договоров. Нью-Йорк—Женева. 1994. Т. 1—2.

78. Пранчак Л. Беларуская Амерыка. Мн., 1994.

79. Прыбытко Г. Беларуская Масква. Кароткі праваднік па расейскай сталіцы // Беларуская мінуўшчына. 1994. № 2.

80. Разанаў А., Сачанка І., Чалядзінскі А., Шарапа А. Прыярытэты знешне-палітычнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 2.

81. Раманоўскі І. Сучасныя палітычныя партыі на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 1.

82. Религия и права человека. На пути к свободе совести. М., 1996.

83. Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. Мн., 2001.

84. Русак Л. Г. Переводной и простой вексель. Мн., 1995.

85. Русецкі А. Уладзімір Караткевіч і сучасная беларуская мастацкая культура // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 4.

86. Рэзалюцыя II з'езда настаўнікаў Рэспублікі Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 6.

87. Сарокін А. М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917—1990 гг.). Мн., 1999.

88. Сасноўскі П. Паўстагоддзя трагедыі нашага сялянства // Спадчына. 2000. № 5—6.

89. Сачанка Б. Беларуская эміграцыя. Мн., 1991.

90. Святліцкі І. Эпоха фармальнага цэнаўтварэння. Чаму Сталін мог зніжаць цэны // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 1.

91. Святліцкі І. Падаткі: генезіс і гістарычная пераемнасць відаў падаткаабкладання // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 1.

92. Святліцкі І. Заработная плата ў святле гістарычнай практыкі // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 2.

93. Сідарэвіч А. Самавызначэнне беларускай сацыял-дэмакратыі // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 2.

94. Сидоренко А. Д. Жилищное строительство в Республике Беларусь в 1996—2000 гг.: соц.-экон. результаты и тенденции. Мн., 2001.

95. Сидорцов В. Н. Методология исторического исследования и механизм творчества историка. Мн., 2000.

96. Сільчанка М. У., Басюк І. А. Асноўныя этапы беларускай дзяржаўнасці. Гродна, 1995.

97. Слука А. Нацыянальная ідэя — аснова грамадзянскага яднання // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 2.

98. Слука А. Сучасны гістарычны працэс і ідэалогія беларускай дзяржаўнасці для XXI стагоддзя // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 4.

99. Смяховіч М. Нацыянальная ідэя беларусаў у XX ст. (гістарыяграфічны аналіз праблемы) // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 3.

100. Смяховіч М. Тэорыя і прынцыпы гістарычнага пазнання ў даследаваннях па гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 4.

101. Социальные проблемы молодежи Белоруссии. Мн., 1999.

102. Союз Белоруссии и России в цифрах. Стат. сб. Мн., 2001.

103. Сяргеева Г. Беларуская дыяспара і дзяржаўная палітыка: набыткі і праблемы // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 2.

104. Тарасевіч У. Беларуская вёска: мінулае і сучаснасць // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 4.

105. Туга па Радзіме. Паэзія беларускай эміграцыі.

106. Тэзісы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 1000-годдзю Полацкай епархіі і праваслаўнай Царквы на Беларусі. 25 верас. 1992. Мн., 1992.

107. Фалькевич И. Формирование государственных отношений Республики Беларусь во внешнеполитической деятельности. Мн., 1999.

108. Філістовіч М. Спадчына Чарнобыльскай зоны: праблемы захавання // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 3.

109. Хаміцэвіч Я. Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 1.

110. Ціханаў Л. Вышэйшая школа на мяжы XXI стагоддзя: рэгіянальны аспект // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 4.

111. Чалядзінскі А. Шляхі і перспектывы ААН // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 3.

112. Часноўскі М. Беларуска-польскія адносіны 1996—1999 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 3.

113. Шадурскі В. Супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з еўрапейскімі краінамі ў галіне культуры // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 1.

114. Шэйкин Г. Двухсотлетие Минской епархии // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 4.

115. Шелег Н. С. Потребительский рынок Беларуси: этапы, проблемы, перспективы. Мн., 2001.

116. Шмата В. Спадчына, якую трэба ратаваць. // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 4.

117. Эканамічная гісторыя Беларусі. Мн., 1994.

118. Экономическая история Беларуси: Учеб. пособие для студ. экон. специальностей вузов / Под ред. В. И. Голубовича. Мн., 2001.

119. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1993—2001. Т. 1—6.

120. Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Навук. канф. (Мн., 6—7 снеж. 2000 г.). Мн., 2001.

121. Этнография Белоруссии: Энцикл. Мн., 1999.

122. Эхо А. Я. Кароткі нарыс гісторыі і права Беларусі. Мн., 1992.

123. Языковіч Л. Рэлігійнае жыццё беларускай эміграцыі // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 2.

124. Яскевіч Я. Стратэгія рызыкі ва ўмовах гістарычнага выбару Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 2.

## ЗМЕСТ

МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ КУРСАВЫХ І ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ .... 3
Выбар тэмы .... 3
Выкананне курсавой і дыпломнай работ .... 3
Асноўныя патрабаванні да курсавой і дыпломнай работ .... 4
Афармленне работы .... 5
Абарона курсавой і дыпломнай работ .... 6
Дадатак № 1. Узор тытульнага ліста курсавой работы .... 7
Дадатак № 2. Узор тытульнага ліста дыпломнай работы .... 8

Раздзел 1. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ АД СТАРАЖЫТНАСЦІ ДА ПАЧАТКУ XIII СТ. .... 9

Раздзел 2. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (сярэдзіна XIII — першая палова XVII ст.) .... 14

Раздзел 3. ВОЙНЫ І САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ КАНФЛІКТЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVII — XVIII СТ. КРЫЗІС ПРЫГОННІЦКАЙ СІСТЭМЫ (канец XVIII — першая палова XIX ст.) .... 21

Раздзел 4. СТАНАЎЛЕННЕ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА Ў БЕЛАРУСІ. ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ (1861—1900 гг.) .... 29

Раздзел 5. БЕЛАРУСЬ У ПАЧАТКУ XX ст. (1901—1914 гг.) .... 34

Раздзел 6. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І САВЕЦКА-ПОЛЬСКАЙ ВАЙНЫ (1914—1920 гг.) .... 40

Раздзел 7. БЕЛАРУСЬ У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1921—1939 гг.) .... 45

Раздзел 8. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ .... 50

Раздзел 9. БЕЛАРУСЬ У ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1945—1985 гг.) .... 57

Раздзел 10. БЕЛАРУСЬ СУЧАСНАЯ .... 66

*Вучэбнае выданне*

# КУРСАВЫЯ І ДЫПЛОМНЫЯ РАБОТЫ па гісторыі Беларусі

## *Метадычныя рэкамендацыі*

*Складальнікі:* Забаўскі Мікалай Міхайлавіч
Канапацкі Ібрагім Барысавіч
Кушнер Васіль Фёдаравіч
Лютая Анжэла Эдуардаўна
Пілецкі Віктар Аляксандравіч
Рацько Аляксандр Фёдаравіч
Сакалоў Мікалай Канстанцінавіч (адказны рэдактар)
Шкуцько Леанід Леанідавіч
Цобкала Андрэй Анатольевіч

*Рэдактар* Л. М. Каранеўская

Падпісана ў друк 17.01.03. Фармат 60×84 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура *школьная*. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 4,4. Ул.-выд. арк. 4,8.
Тыраж 100 экз. Заказ 619.

*Установа адукацыі* «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».
Ліцэнзія ЛВ № 196 ад 04.02.98. 220050, Мінск, Савецкая, 18.

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:* Вучэбна-выдавецкі цэнтр БДПУ.
Ліцэнзія ЛП № 486 ад 02.04.02. 220007, Мінск, Магілёўская, 37.